


Всех женщин – врачей в Гродненской губернии с 1900 по 1913 год было 51 чел. В период с 1900 по 1909 год количество женщин – врачей стояло на уровне двух человек. А вот в период с 1910 по 1913 год наблюдается значительный рост. Например, в 1910 и 1912 году их количество достигает семи человек, а вот в 1913 году это уже 10 человек [3, 1–12].

В изучаемый период в Гродненской губернии в системе медицинских кадров и медицинской помощи как в городе, так и сельской местности, играли фельдшеры. Фельдшер – специалист со средним специальным медицинским образованием, который имеет право проводить диагностику и устанавливать диагноз, проводить самостоятельное лечение или направлять пациента к врачу-специалисту.

По должностным обязанностям и стандартам работы в местах, отдалённых от врачебной помощи, принципиально не отличается от участкового терапевта и врача скорой помощи. Медицинская помощь, оказываемая фельдшером, называется доврачебной.

### 🕮 БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК

1. Иващенко, Н. А. Александр Тальгейм и его Муза / Н. А. Иващенко // Гродна і гродзенцы: дзесяць стагодзяў гісторыі (да 880 – годдзя горада): матэрыялы навуковай канферэнцыі / Гродзенскі дз. ун-т ім. Янкі Купалы; под рэд. А. І. Антоненка, А. А. Каваленя, Я. А. Роўба. – Гродно, 2008. – С. 464–469.
2. Гістарычна – дакументальная хроніка “Памяць г. Гродна.” Мн. : КП ”Паліграфафармленне”, 1999. 590 с.
3. Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно (НИАБ в г. Гродно). Фонд 9. – Оп. –6. – Д 126.«Личные карточки врачей»
4. Обзор Гродненской губернии за 1900 год: Гродно : Губернская типография, 1901. – 153 с.

# СКАСАВАННЕ ІНСТЫТУТА ЗЕМСКІХ УЧАСТКОВЫХ НАЧАЛЬНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ХОДЗЕ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г.

***І. Г. Гушчынскі,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*намеснік дэкана па вучэбнай рабоце факультэта дашкольнай адукацыі УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”*

У 1901 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях [1, арк. 524], а ў 1904 г. у Гродзенскай і Віленскай [2], пачалі дзейнічаць земскія участковыя начальнікі. Дадзеныя пасады былі прадугледжаны законам ад 12 ліпеня 1889 г. [3] . Асноўны яго змест заключаўся ва ўвядзенні пасад земскіх участковых нальнікаў, якія прызначаліся міністрам унутраных спраў (звычайна з ліку мясцовага маёнткавага дваранства). Яны аб’ядноўвалі ў сабе функцыі адміністрацыйнай улады ў адносінах да сялян і суддзі (замест скасаваных міравых суддзяў). Безумоўна, увядзенне інстытута земскіх участковых начальнікаў супярэчыла прынцыпам усесаслоўнасці судоў і аддзялення судовай улады ад адміністрацыйнай. Улічваючы, што дадзеныя пасады, як правіла, займалі асобы з асяродку мясцовых памешчыкаў, гэта азначала ўзмацненне пазіцый дваранства. Па гэтай прычыне інстытут земскіх участковых начальнікаў на тэрыторыі Беларусі быў уведзены значна пазней, толькі ў пачатку XX ст., бо расійскія ўлады з недаверам ставіліся да мясцовага дваранства. Праблема ўвядзення і дзейнасці земскіх участковых начальнікаў на тэрыторыі Беларусі дастаткова падрабязна раскрыта ў навуковай літаратуры. Прынамсі ў працах А. А. Страленi [4] і С. А. Талмачовай [5]. Аднак яны практычна не закранaлі тэму ліквідацыі дадзенага інстытута ў 1917 г.

Трэба адзначыць, яшчэ ў 1912 г. расійскім урадам было прынята рашэнне аб новай рэформе мясцовага суда. Паводле закона ад 15 чэрвеня 1912 г. [6] вяртаўся інстытут міравых судоў, якім перадаваліся судовыя функцыі земскіх участковых начальнікаў. Пры гэтым самі пасады земскіх участковых начальнікаў захоўваліся, але цяпер без судзейскіх паўнамоцтваў. У Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях дадзены заканадаўчы акт павінен быў быць уведзены ў 1915 г., аднак па прычыне Першай сусветнай вайны гэтага не адбылося. Таму земскія ўчастковыя начальнікі дзейнічалі на папярэдніх падставах на тэрыторыі Беларусі (на неакупаванай яе частцы) да сакавіка 1917 г., пакуль у выніку Лютаўскай рэвалюцыі дадзеныя пасады не былі скасаваны Часовым урадам.

Часовы ўрад у якасці асновы сваёй палітыкі ў сферы суда абвясціў не пабудову новай судовай сістэмы замест старой, а вяртанне да першапачатковых прынцыпаў судовай рэформы 1864 г. Г. зн. павінны былі быць скасаваны тыя карэкціроўкі, якія былі ўнесены самадзяржаўем у судовую сістэму пасля рэформы для абмежавання яе ліберальных прынцыпаў – усесаслоўнасці, незалежнасці судовай улады, галоснасці, выбарнасці суддзяў і інш. [7, стр. 111]. Інстытут жа земскіх участковых начальнікаў, безумоўна, па сваёй сутнасці супярэчыў гэтым пастулатам. Таму адным з першых захадаў Часовага ўрада па рэфармаванні судовай сістэмы стала прыпыненне іх дзейнасці.

21 сакавіка 1917 г. старшыня Часовага ўрада Георгій Львоў паведаміў губернскім камісарам аб неабходнасці неадкладна прыпыніць дзейнасць земскіх участковых начальнікаў. Іх судовыя функцыі ускладаліся на часовых суддзяў, якія прызначаліся губернскімі камісарамі па ўзгадненні з павятовымі камісарамі [8, арк. 4]. Часовыя суддзі павінны былі дзейнічаць да моманту ўкаранення новых правілаў аб уладкаванні мясцовага суда. Неўзабаве, 4 мая 1917 г., была прынята адпаведная пастанова Часовага ўрада, якая прадугледжвала ўвядзенне выбарных міравых судоў. З пачаткам іх працы часовыя суддзі павінны былі скласці паўнамоцтвы [9, с. 224–238].

У розных губернях ідэя замены земскіх участковых начальнікаў часовымі суддзямі вясной 1917 г. была рэалізавана з рознай ступенню паспяховасці. У Мінскай губерні, прычым ва ўсіх яе паветах, часовыя суддзі былі прызначаны і прыступілі да выканання сваіх абавязкаў у красавіку 1917 г. [8, арк. 23–26]. Яны тут дзейнічалі, пакуль дадзеныя пасады не былі скасаваны бальшавікамі ў канцы 1917 г. Справа ў тым, што да гэтага часу выбары міравых суддзяў, за выключэннем Барысаўскага павета [10, арк. 22], тут так і не былі праведзеныя. У Віцебскай губерні спроба замяніць скасаваных земскіх начальнікаў часовымі суддзямі фактычна не ўдалася. Яны пэўны час функцыянавалі толькі ў Невельскім, Полацкім, Себежскім і, магчыма, Віцебскім паветах [11, арк. 38–46]. На большай жа частцы Віцебскай губерні ў сельскай мясцовасці да моманту пачатку працы выбарных міравых суддзяў (г. зн. да чэрвеня-жніўня 1917 г. у залежнасці ад павета [11, арк. 38–46]) склалася сітуацыя, калі функцыі мясцовага суда, якія раней належалі земскім начальнікам, увогуле ніхто не выконваў. Што датычыць Магілёўскай губерні, то, на жаль, канкрэтных звестак аб скасаванні тут пасад земскіх участковых начальнікаў і прызначэнні замест іх часовых суддзяў выявіць не ўдалося.

У Мінскай губерні часовыя суддзі прызначаліся губернскім камісарам (Барысам Самойленкам) па прапанове павятовых камісараў. Пры гэтым асноўнай дылемай для іх пры фарміраванні асабовага складу часовых суддзяў стала пытанне аб прыцягненні на дадзеныя пасады былых земскіх участковых начальнікаў.

Трэба адзначыць, што былым земскім начальнікам служба ў органах суда не была забаронена ні пастановамі Часовага ўрада, ні цыркулярамі Міністэрства юстыцыі, ні іншымі афіцыйнымі ўрадавымі дакументамі. З іншага боку, іх прызначэнне на пасады часовых суддзяў успрымалася ў грамадстве неадназначна. Земскія ўчастковыя начальнікі ў масавай свядомасці ўвасаблялі парадкі толькі што звергнутага і крайне непапулярнага рэжыму. У дадзеным кантэксце паказальны чарнавы варыянт тэксту пасведчання на імя былога земскага начальніка Мазырскага павета Сяргея Юнакова, які захаваўся ў дакументах канцылярыі Мінскага губернскага камісара [12, арк. 17–17 адв.]. Там было напісана: “На должность временного мирового судьи Юнаков не был назначен лишь в виду общего принятого руководства не назначать на эту должность лиц, бывших земскими начальниками, так как по отношению вообще к этим лицам существовало неприязненное отношение среди крестьянского населения”. Дадзены дакумент не быў падпісаны і статус афіцыйнага не набыў. Тым не менш гэта паказвае, што пры падборы асабовага складу часовых суддзяў кандыдатуры былых земскіх начальнікаў бачыліся непажаданымі. У той жа час яны мелі досвед судзейскай дзейнасці, у некаторых выпадках юрыдычную адукацыю, часта дзякуючы сваёй працы карысталіся сапраўдным аўтарытэтам і павагай ў асяродку насельніцтва. Акрамя таго, меў месца дэфіцыт ахвотных і пры гэтым здольных выконваць судзейскія абавязкі, у выніку чаго былыя земскія начальнікі у некаторых паветах заставаліся практычна адзінымі кандыдатурамі.

Напрыклад, з-за недахопу асоб, прыдатных для выканання абавязкаў часовых суддзяў, Слуцкі павятовы камісар Радаслаў Астроўскі унёс у спіс кандыдатур на дадзеныя пасады былых земскіх начальнікаў Яўгена Саракаумава і Мікалая Флараэнцінскага. Пры гэтым на конт іх Астроўскі сам меў сумненні – у сувязі з іх “недостаточно корректным отношением к общественным силам”, асабліва з боку Саракаумава. Аднак іншых асоб для замяшчэння дадзеных вакансій, па словах слуцкага павятовага камісара, не было [13, арк. 3]. Неўзабаве з хадайніцтвам у падтрымку Флараэнцінскага да губернскага камісара звярнуліся князь А. Г. Радзівіл і нясвіжскі

параённы камісар Бароўскі. Яны адзначалі бесстароннасць і справядлівасць Фларэнцінскага пры разглядзе спраў, яго ліберальныя перакананні, а таксама павагу і давер з боку насельніцтва [13, арк. 11]. У выніку ён на пасадзе быў зацверджаны, у адрозненне ад Саракаумава. Як бачым, пры фарміраванні складу часовых суддзяў улічваліся не толькі асабістыя і прафесійныя якасці кандыдатаў, але і адпаведнасць іх палітычных поглядаў грамадскім настроям.

Усяго па Мінскай губерні каля паловы прызначаных у красавіку 1917 г. часовых суддзяў (30 з 61) з'яўляліся былымі земскімі ўчастковымі начальнікамі. Астатнія – з ліку кандыдатаў на судовыя пасады, адвакатаў, памешчыкаў і інш. [14 арк. 32–34 адв.].

Самі былыя земскія начальнікі, застаўшыся без працы, вымушаны былі звяртацца да павятовых і губернскага камісараў з просьбамі аб прызначэнні часовымі суддзямі. Такія прашэнні часта падмацоўваліся адпаведнымі хадайніцтвамі валасных камітэтаў (органаў сялянскага самакіравання, якія замянілі валасныя праўленні) або проста подпісамі насельніцтва ў падтрымку іх кандыдатур [8, арк. 8, 14], [10 арк. 3, 9, 11]. Напрыклад, у сакавіку 1917 г. 42 жыхара мястэчка Зембін Барысаўскага павета паставілі подпісы пад хадайніцтвам аб прызначэнні часовым суддзёй былога мясцовага земскага начальніка Мікалая Бруяка [10, арк. 9]. А ў звароце мінскаму губернскаму камісару ад імя прыхаджан Валасовічскай царквы Бабруйскага павета (ад 28 мая 1917 г.) было ўвогуле напісана, што ім не патрэбны суддзя, "будь он хоть доктором права с европейской изящностью ученого человека", а патрэбны ў судзейскім крэсле чалавек, знаёмы з умовамі мясцовага жыцця, а таксама іх правамі і звычаямі – г. зн. былы земскі ўчастковы начальнік Платон Ральцэвіч [15, арк. 32]. Яшчэ адзін былы земскі ўчастковы начальнік Бабруйскага павета Нікалаеў збіраў подпісы за яго прызначэнне часовым суддзёй. Аднак у канцы красавіка 1917 г. мінскаму губернскаму камісару паступіў зварот ад жыхароў Парычскай воласці, у якім гаварылася, што ім тая папера была падсунутая ў начны час, падпісаліся яны толькі пад уплывам просьбаў і ўгавораў, але зараз азнаёміліся з былой судзейскай дзейнасцю Нікалаева і катэгарычна адмаўляюцца ад сваіх подпісаў [15, арк. 8].

Нярэдка прызначэнне былых земскіх участковых начальнікаў сустракала супрацьдзеянне з боку грамадскасці. Напрыклад, 29 сакавіка 1917 г. на пасяджэнні Мінскага камітэта пры павятовым камісары ў выніку абмеркавання 8-мі кандыдатур на пасады часовых суддзяў Мінскага павета 5 з іх не былі зацверджаны па прычыне таго, што былі былымі земскімі ўчастковымі начальнікамі [8, арк 9 – 9 адв.]. Аднак у далейшым у Мінскім павеце шэраг былых земскіх начальнікаў усё ж такі быў прызначаны часовымі суддзямі [8, арк. 20].

Аб недапусцімасці прызначэння часовымі суддзямі былых земскіх участковых начальнікаў выказаўся Сялянскі з'езд, які адбыўся ў красавіку 1917 г. у Мінску. Спасылаючыся на яго, 26 красавіка адпаведнае рашэнне прыняў Бабруйскі павятовы выканаўчы камітэт. Аднак да гэтага часу ў дадзеным павеце часовыя суддзі ўжо былі прызначаныя і прыступілі да выканання абавязкаў (палова з іх, 4 з 8-мі, былі былымі земскімі начальнікамі) [15, арк. 15–15 адв.]. Мяркуючы па ўсім, на былых земскіх начальнікаў быў аказаны пэўны ціск, каб яны склалі судзейскія паўнамоцтвы. У такіх абставінах дадзеныя суддзі выконваць свае абавязкі фактычна не маглі, аднак і адмаўляцца ад пасад не сталі. У сувязі з гэтым Бабруйскі павятовы камісар 5 мая звярнуўся да Мінскага губернскага камісара з пытаннем, што рабіць, калі былыя земскія начальнікі так і не звольняцца? У адказе гаварылася, што рашэнні Сялянскага з'езда – "лишь пожелания", а зацверджаныя на пасадах часовыя суддзі могуць быць адхілены ад пасад толькі па рашэнні суда і павінны неадкладна прыступіць да выканання сваіх судзейскіх абавязкаў [15, арк. 16–17]. На гэтым Бабруйскі павятовы выканкам не спыніў спроб дабіцца звальнення былых земскіх начальнікаў, звярнуўшыся ў канцы ліпеня з адпаведнай просьбай у Міністэрства юстыцыі. Але зноў атрымаў адмову, бо для гэтага не было законных падстаў [15, арк. 26 адв.].

У Слуцкім павеце на адну з пасад часовых суддзяў быў прызначаны і прыступіў да выканання абавязкаў былы земскі начальнік Аляксандр Кавалеўскі. Аднак 28 мая 1917 г. камітэт грамадскіх арганізацый пры Клецкім участковым камісары правёў свае выбары кандыдата на дадзеную пасаду. У іх прынялі ўдзел 43 члены камітэта: мясцовыя сяляне і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый Клецка. Кандыдатам на пасаду часовага суддзі імі быў выбраны выхадзец з мясцовага сялянства Пётр Мартышэнка, які меў пасведчанне аб заканчэнні курса юрыдычных навук Кіеўскага ўніверсітэта. Пасля гэтага камітэтам была накіравана ў Мінстэрства юстыцыі просьба аб прызначэнні Мартышэнка часовым суддзёй замест Кавалеўскага. Прычым у хадайніцтве падкрэслівалася, што яно накіравана не супраць канкрэтнай кандыдатуры Кавалеўскага, а выражае прынцыповую нязгоду бачыць у якасці суддзяў былых земскіх начальнікаў наогул [13, арк. 52–53]. Аднак Клецкаму камітэту ў просьбе было адмоўлена, бо, згодна з законам, ужо прызначаны часовы суддзя мог быць звольнены толькі ў выпадку здзяйснення ім злачынства ці па ўласным жаданні [13, арк. 54–54 адв.].

У некаторых выпадках супраць прызначэння былых земскіх начальнікаў часовымі суддзямі выступалі валасныя камітэты ці нават асобныя грамадзяне. Вось некалькі прыкладаў такога роду канфліктаў.

У Рэчыцкім павеце сярод прызначаных часовых суддзяў аказалася 4 былыя земскія начальнікі (а таксама 1 памешчык і 2 адвакаты). Аднак дадзеныя 4 суддзі (Яжгуровіч, Каморны, Мацкевіч і Качуроўскі) адразу да

выканання абавязкаў не прыступілі з-за супрацьдзеяння валасных камітэтаў. З 12 па 16 красавіка 1917 г. у Рэчыцы праходзіў з'езд прадстаўнікоў валасных камітэтаў павета. 14 красавіка пасяджэнне зацягнулася далёка за поўнач, і калі ў 3 гадзіны ночы дэлегаты сабраліся разыходзіцца, шэраг сялян, сярод якіх вылучаўся прадстаўнік Мікуліцкага валаснога камітэта Рахманаў, настаялі на неадкладным абмеркаванні пытання аб прызначэнні на пасады часовых суддзяў былых земскіх участковых начальнікаў. Пасля чаго пасяджэнне працягнулася. Урэшце было прынята рашэнне дазволіць былым земскім начальнікам быць часовымі суддзямі, але толькі са згоды мясцовых валасных камітэтаў. Аднак назаўтра, як толькі праца з'езда аднавілася, Рахманаў зноў узняў дадзенае пытанне. Ён наракаў на тое, што ўчора з-за позняга часу і стомленасці прысутныя не разабраліся ў сутнасці рэзалюцыі. У выніку большасцю галасоў было пастаноўлена адхіліць ад пасад былых земскіх начальнікаў, выбраць і прадставіць павятоваму камісару на зацвярджэнне свае кандыдатуры [16, арк. 18–18 адв.]. Пасля гэтага згаданыя 4 часовыя суддзі адмовіліся прыступаць да працы да канчатковага вырашэння сітуацыі. І толькі пасля таго, як 27 мая Мінскі губернскі камісар выказаўся аб немагчымасці адхілення іх ад пасад і прапанаваў прыняць справы, яны прыступілі да выканання абавязкаў [16, арк. 20, 37 адв.].

Супраціўленне з боку Заслаўскага і Ракаўскага валасных камітэтаў Мінскага павета сустрэла прызначэнне сюды часовым суддзёй былога земскага начальніка Івана Бабічава. Яшчэ ў канцы сакавіка 1917 г. Заслаўскі валасны камітэт звярнуўся ў Мінскі павятовы камітэт з хадайніцтвам не прызначаць часовымі суддзямі былых земскіх начальнікаў, а асоб выключна з сялянскага і мяшчанскага саслоўяў [17, арк. 19]. Тым часам шэраг былых земскіх участковых начальнікаў падалі Мінскаму павятоваму камісару Мікалаю Гушчынскаму адпаведныя прашэнні. Сярод іх быў І. Бабічаў, у падтрымку прызначэння якога на пасаду часовага суддзі падпісаліся некалькі дзясяткаў жыхароў Ракаўскай і Заслаўскай валасцей [17, арк. 20–21 адв.]. Аднак яго кандыдатура выклікала шэраг пратэстаў. Спачатку меў месца ананімны зварот "жителя Заславля" да Мінскага губернскага камісара Барыса Самойленкі і міністра юстыцыі Аляксандра Керанскага ад 30 сакавіка 1917 г., у якім гаварылася: "Бабичев – известный взяточник, плохой человек, крыса старого режима, …как нечестный человек в мировые судьи не годится" [17, арк. 3]. А 7 красавіка Заслаўскі валасны камітэт пастанавіў: "Принимая во внимание в высшей степени вредную деятельность земских начальников вообще, а Бабичева в особенности – просить г. Минского губернского комиссара, чтобы …никто из бывших земских начальников не был назначен в Заславский участок мировым судьёй" [17, арк. 36]. Адпаведнае рашэнне прыняў і Ракаўскі валасны камітэт [17, арк. 37]. У выніку Бабічаў на пасаду часовага суддзі 3-га ўчастка, у склад якога ўваходзілі дадзеныя валасці, прызначаны не быў. Але яе атрымаў іншы былы земскі начальнік – Барыс Языкоў [17, арк. 32].

Канфліктная сітуацыя склалася таксама вакол прызначэння былога земскага начальніка Уладзіміра Чарняўскага часовым суддзёй 5-га ўчастка Мінскага павета. Ён быў зацверджаны на пасадзе Мінскім губернскім камісарам і ў красавіку 1917 г. прыступіў да выканання абавязкаў. Аднак 19 мая 1917 г. Івянецкі валасны сход, у якім прынялі ўдзел 52 чалавекі, пастанавіў звярнуцца да губернскага камісара з просьбай адхіліць Чарняўскага ад пасады ў сувязі з катэгарычнай нязгодай насельніцтва мець такога суддзю [17, арк. 53]. Аднак была атрымана адмова [17, арк. 75]. 4 чэрвеня 1917 г. Івянецкі валасны камітэт пры ўдзеле члена мясцовага савета салдацкіх дэпутатаў Пашкевіча разгледзеў адказ губернскага камісара і пастанавіў: "Имея в виду, что Чернявский народу не желателен как бывший земский начальник, и что в настоящее время служащие избираются от народа, а не назначаются… – категорически потребовать от губернского комиссара исполнения воли народа" [17, арк. 75–75 адв.]. А 28 чэрвеня мясцовы валасны сход прыняў рашэнне не прымаць ад суддзі Чарняўскага павестак і прасіць начальства абавязкова адхіліць яго ад пасады. Абгрунтоўвалася гэта тым, што ён "при старом режиме показал себя с очень плохой стороны, судил неправильно", "обращался с людьми прямо не по-человечески", "вёл безнравственную жизнь" [17, арк. 57–57 адв.]. Тым не менш Чарняўскі заставаўся на пасадзе, пакуль у верасні 1917 г. не быў пераведзены па службе ў Петраград на пасаду памочніка начальніка канцылярыі Міністэрства юстыцыі [17, арк. 80].

Такім чынам, інстытут земскіх участковых начальнікаў быў скасаваны Часовым урадам у сакавіку 1917 г. Такая мера была цалкам натуральнай у кантэксце тэндэнцый абнаўлення і дэмакратызацыі грамадскага жыцця, а таксама адпавядала ўяўленню аб інстытуце земскіх участковых начальнікаў як перажытку звергнутага рэжыму, а аб саміх гэтых чыноўніках – як адданых самадзяржаўю службоўцах. Аб гэтым сведчыць тое, што прызначэнне вясной 1917 г. былых земскіх начальнікаў органамі Часовага ўрада на судзейскія пасады часта сустракала супрацьдзеянне розных палітычных сіл і насельніцтва. З іншага боку, адносіны ў грамадстве да саміх асоб, якія займалі гэтыя пасады (а не як да дадзенага інстытуту судова-адміністрацыйнай улады ў цэлым), не былі суцэльна негатыўнымі.

## 🕮 БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 159.
2. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – Собр. 3. – Т. 23. – 1903. – Отд. 1. – № 23106.

3. ПСЗРИ. – Собр. 3. – Т. 9. – 1889. – № 6196.
4. Страленя, А. А. Увядзенне пасады земскіх начальнікаў на тэрыторыі Беларусі і іх дзейнасць / А. А. Страленя // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 5. – С. 29–38.
5. Талмачова, С. А. Кадравая палітыка расійскага ўрада ў дачыненні да інстытута земскіх начальнікаў ў Беларусі ў пачатку XX ст. / С. А. Талмачова // Образование и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке. – Минск : БГПУ, 2018. – Т. 1. – С. 144–149.
6. ПСЗРИ. – Собр. 3. – Т. 32. – 1912. – № 37328.
7. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля – 5 мая 1917 г. / сост. Отд-нием Свода Законов Гос. Канцелярии. – Петроград : Государственная канцелярия, 1917. – VI, 2, 555 с.
8. НГАБ. – Ф. 1684. Воп. 1. Спр. 8.
9. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 2. 5 мая – 24 июля 1917 г. : в 2 ч. / сост. Упр-нием Кодификацион. частью. – Петроград : Государственная канцелярия, 1918. – Ч. 1. – Отд. I–VIII – VII, 799 с.
10. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 3.
11. НГАБ. – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 37.
12. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 6.
13. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 11.
14. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 1.
15. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 2.
16. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 10.
17. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 5.

# ЭТНАГРАФІЧНЫЯ МУЗЕІ БЕЛАРУСІ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ І АДНАЎЛЕННЯ КАЛЕКТЫЎНАЙ ПАМЯЦІ ГРАМАДСТВА

***Д. У. Дубінін,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі,*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя Максіма Танка”*

Этнаграфія даследуе культурна-бытавыя асаблівасці народаў свету ў іх гістарычным развіцці; вывучае праблемы паходжання, культурна-гістарычныя узаемаадносіны этнасаў; паказвае гісторыю іх рассялення і перамяшчэння. Арыентацыя грамадства на мінулае фарміруе яго этнічную ідэнтычнасць, якая грунтуецца на ведах пра агульнасць паходжання, вераванні, традыцыі, матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

Адной з формаў захавання і аднаўлення калектыўнай памяці грамадства з'яўляюцца этнаграфічныя музеі, якія адначасова выступаюць і ў якасці інстытута сацыяльнай памяці. Этнаграфічныя музеі адбіраюць, захоўваюць, даследуюць, экспануюць і інтэрпрэтуюць першакрыніцы ведаў пра матэрыяльную і нематэрыяльную культурную спадчыну этнасу, дакументуюць працэсы этнагенезу, побыт і культуру розных этнічных супольнасцяў [2]. У сваёй большасці этнаграфічныя музеі размешчаны у музейных будынках, пабудаваных ці спецыяльна прыстасаваных пад іх патрэбы.

Але напрыканцы XIX і ў пачатку XX стагоддзя найбольш распаўсюджанай становіцца форма этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам, якія вызначаюцца як музеі, што ствараюцца на аснове нерухомых помнікаў і архітэктурна-ландшафтных комплексаў, што ўтвараюцца помнікамі і іх прыродным асяроддзем. У якасці месца захоўвання і экспанавання такіх аб'ектаў выступае музейная тэрыторыя [3].

Музеі пад адкрытым небам ажыццяўляюць комплекснае захоўванне і дэманстрацыю побыту і культуры чалавечых супольнасцяў у натуральным асяроддзі і характарызуюцца як адна з найбольш эфектыўных формаў этнаграфічных музеяў.

Першы музей пад адкрытым небам быў ўпершыню створаны ў 1891 годзе шведскім філолагам і этнографам Артурам Хазеліусам ў Скансане, на ўскраіне Стакгольма. Канцэпцыя стварэння музея – «Швед, Пазнай сябе». У структуру музея ў Скансане ўвайшлі звезеныя туды з усіх куткоў Скандынаўскага паўвострава старадаўнія пабудовы, у тым ліку сялянскія дамы, памешчыцкія сядзібы, майстэрні, дваровыя службы, свірны, крамы, царква. Была сабрана аўтэнтычная мэбля і начынне для інтэр'ераў будынкаў. Экскурсаводы ў традыцыйных касцюмах распавядалі наведвальнікам Скансена пра традыцыи і жыццё ранейшых жыхароў дамоў, прадстаўленых у музеі. Набажэнствы і вянчанне адбываліся ў драўлянай царкве XVIII стагоддзя. Музыкі выконвалі старадаўнія мелодыі, спевакі спявалі старадаўнія песні, танцоры танцавалі нацыянальныя танцы.